прэзентацыі

# Цяжкія дарогі жыцця

**Прэзентацыя мемуараў народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Падчас мерапрыемства пісьменнік прадставіў гледачам чатыры кнігі з цыкла аўтабіяграфічных раманаў «Цяжкія дарогі жыцця». Асаблівая ўвага — двум апошнім тамам, у якія ўвайшлі ўспаміны з 1940-х да 1990-х гадоў. Аўтар таксама прыадкрыў заслону таямніцы і расказаў, пра што будзе наступная кніга, якая выйдзе ўжо сёлета.**

— У ёй я пішу пра перыяд развалу Савецкага Саюза: цяжкі час, крытычны стан краіны, развал эканомікі, людзі на вуліцах бурляць, патрабуючы заробку і працы, заводы стаяць… Тады мы і пазнаёміліся з Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам. Я на той момант не верыў, што малады хлопец з вёскі зможа дапамагчы беларусам. І памыліўся. З яго энергіяй і выключным талентам удалося гэта зрабіць. Буду пра гэта пісаць.

Генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін распавёў, што пазнаёміўся з творчасцю Мікалая Іванавіча вельмі даўно, і адзначыў:

— Ён пражыў некалькі жыццяў, перажыў вайну, сябраваў з сям'ёй Гагарына, у складзе футбольнай каманды трапіў у разбураны Пхеньян і бачыў Кім Ір Сена, затым перайшоў у крымінальны вышук і першым з кіраўніцтва прыехаў на месца трагічнай гібелі Пятра Машэрава.



*Мікалай Чаргінец.*

Я асабіста ад афганцаў чуў гісторыі пра тое, як Мікалай Чаргінец ратаваў людзям жыццё.

На мерапрыемстве кожны ахвотны мог азнаёміцца з тэматычнай выстаўкай, у якой былі прадстаўлены матэрыялы з фондаў бібліятэкі аб жыццёвым і творчым шляху Мікалая Чаргінца, а таксама рэдкія экзэмпляры кніг з асабістага архіва аўтара.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота Віктара ІВАНЧЫКАВА**